Праект «Распрацоўка інтэграванага падыходу да пашырэння праграмы па энергазберажэнні»
www.energybel.by

# Прыгоды «Хуткай энергетычнай дапамогі»

# Размалёўка «Як школу лекавалі» і «Цмок і Рэкуператар»

Мінск 2015

Складальнікі:

Мастак: Воля Кузьміч

Дызайн і вёрстка: Вераніка Ардыцкая

Рэдактар: Руслан Хількевіч

Пад агульнай рэдакцыяй С.М. Нікіціна

# «Як школу лекавалі»




Адна школа – захварэла.









Разбаўталіся дзверы.



Праз шчыліны ў вокнах моцна дзьмула.
Нават урокі адмянілі.







Але вучні паклікалі хуткую энергетычную дапамогу.



Энергетычныя лекары прывезлі ў школу новыя, эканамічныя вокны.





І новыя лямпачкі,
што больш не адбіралі ў школы сілы.










У сталовай з'явілася новая,
эканамічная тэхніка.







А яшчэ ўсталявалі сонечны калектар,
які дадаў школе моцы.




А ў здаровай школе
і вучыцца – весела!



# «Цмок і Рэкуператар»







Аднойчы рыцару-асілку стала сумна,
і ён вырашыў перамагчы цмока.







Раптам бачыць, а цмок зусім хворы!
Подых у яго агністы, горача яму ў пячоры.
Цмок вокны-дзверы адчыняе,
а скразнякі тут як тут - вось і захварэў, небарака.





Пашкадаваў малойча цмока і выклікаў
«Хуткую энергетычную дапамогу»,
якая ўсталявала ў пячоры сістэму вентыляцыі
з цеплаабменнікам-рэкуператарам.




ЦМОК


ЦМОК





Гарачае паветра,
якое выходзіла з пячоры,
стала награваць халоднае паветра,
што заходзіла са двара.







Цяпер у пячоры заўсёды цёпла,
а паветра – свежае!







Такую ж сістэму вентыляцыі
«Хуткая энергетычная дапамога»
усталявала ў нашай школе!



# Для малюнкаў